спецыялізаваная навучальная ўстанова з мастацка-музычным ухілам. Пры гэтым частка памяшканняў будзе аддадзена пад музей М.Агінскага. У прасторных гасціных палаца зноў будуць праводзіцца музычна-літаратурныя вечары і навуковыя канферэнцыі.

Усё гэта сведчыць, што за апошнія гады адбылося сапраўднае вяртанне Міхала Клеафаса Агінскага на радзіму. Яго імя, яго творы становяцца ўсё больш папулярнымі ў Беларусі, Літве, Польшчы, Расіі.

## ВЫКАРЫСТАННЕ МАТЭРЫЯЛАЎ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў НАВУЧАЛЬНА – ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ *(З ВОПЫТУ НАСТАЎНІКАЎ)*

*УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"*

*Масальская А.І., 5 к., 4 гр., педагагічны факультэт*

*Кафедра педагогікі*
*Навуковы кіраўнік – доцэнт Зянькова М.А.*

Вядома, што беларуская нацыянальная культура прайшла вельмі складаны шлях. Прыкладна ў 90-х гадах 20 стагоддзя яна была амаль выцеснена з навучальна-выхаваўчаха працэсу, але гэтай праблеме не маглі дазволіць праіснаваць доўга навуковыя даследчыкі, перадавыя настаўнікі, якія бесперапынна займаліся распрацоўкай і зборам матэрыялаў.

Уладзімір Мікалаевіч Краж у сваім выданні "Беларускія народныя гульні" адлюстраваў сюжэтна-ролевыя, а таксама гульні-карагоды, дзе арганічна спалучаюцца словы, рухі, песні, народныя мелодыі. Усё гэта садзейнічае выхаванню ў дзяцей цікавасці да беларускай творчасці, да роднай мовы [1].

Беларускія народныя гульні – рухавыя, што дапамагае развіць фізічныя навыкі. Гульня – асноўная форма дзейнасці дзяцей, у якой спалучаюцца два важныя фактары: першы, дзеці атрымліваюць маральнае і эстэтычнае задавальненне, знаёмяцца з народнымі традыцыямі і культурай, лепш пазнаюць навакольнае асяроддзе, а ўсё гэта спрыяе выхаванню развітой асобы школьніка.

Алесь Лозка ў выданні "Восеньскі народны каляндар" распрацаваў мерапрыемствы для пазакласнай работы з дзецьмі. Кожнае мерапрыемства праводзіцца з мэтай выхавання павагі да сваіх продкаў, ашчадныя адносіны да матулі-зямлі, бацькаўшчыны. У гэтым выданні ёсць такія сцэнарыі, як *"Прыйшоў багач", "На нашай ніўцы сёння дажынкі", "Падарожжа ў краіну ветлівасці"*[2].

В.А. Шаляговіч, настаўніца школы № 24 г. Брэста, у сваёй працы вялікае значэнне надае беларускім гульням. Яна прапаноўвае наступныя



Репозиторий ГрГМУ

фрагменты ўрокаў беларускай мовы:

Тэма: "Сказ, віды сказаў паводле значэння і інтанацыі" (паўтарэнне вывучанага ў III- ім класе).

Мэта: абагульніць веды вучняў праз сказ, развіваць уменне аддзяляць паўзай у вуснай мове адзін сказ ад другога, вызначаць колькасць сказаў, замацоўваць уменне вызначаць сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; вызначаць клічны сказ.

ФРАГМЕНТ 1

- Сёння на ўроку мы будзем паўтараць тэму, якую вывучалі ў III-ім класе, – "Сказ". На дошцы запісана лічылка. Прачытайце яе і падлічыце ў ёй колькаць сказаў, – кажа настаўнік.

*Скакаў верабей па сцяне.*
*Зламаў ножку – цяжка мне!*
*Вераб'іха скача*
*Ды па ножцы плача.*
*Верабей, верабей,*
*Не дзяўбі канапель:*
*Ні маіх, ні сваіх,*
*Ні суседзяў маіх.*
*Адгукніся, верабей,*
*Вылятай у круг хутчэй!*

- Колькі сказаў вы налічылі? Пра што гаворыцца ў першым сказе? Што называецца сказам?

- Лічылка, з якой мы сёння пазнаёміліся, завітала да нас з народнай гульні "*Спрытны верабей*", у якую мы зараз і пагуляем…

Замацаванне паняцця "сказ" можа ажыццяўляцца на аснове такіх гульняў, як "*Грушка*", "*Мышка*" і інш., у якіх ёсць лічылкі.

ФРАГМЕНТ 2

Адзін з этапаў настаўнік пачынае з гульні "Проса", у якой паміж "гаспадаром" і "работнікам" адбываецца размова:

- *Прыходзь да мяне проса палоць.*
- *Не хачу.*
- *А кашу есці?*
- *Хоць зараз!*
- *Ах, ты, гультай!*

Настаўнік з вучнямі высвятляюць: колькасць сказаў; што дапамагае ў вуснай і пісьмовай мовах вызначыць тып сказа; якія знакі прыпынку ставяцца ў апавядальных, пытальных, пабуджальных сказах [3].

Ва ўсіх народных гульнях ёсць дыялогі. Дзякуючы ім, вучні без цяжкасцей авалодаюць апавядальнай, пытальнай інтанацыяй, асабліва калі яна эмацыянальна афарбавана.

На кожным уроку беларускай мовы значнае месца трэба адводзіць правільнаму ўжыванню слоў, выразнаму чытанню іх, пераказу,



Репозиторий ГрГМУ

складанню дыялогаў. Развіццё мовы – адна з галоўных задач навучання, якую паспяхова можна вырашыць толькі тады, калі ў дзяцей будзе ўзнікаць жаданне гаварыць. У гэтым плане вельмі карысныя "маўленчыя хвілінкі", якія мы праводзім на аснове гульні. Так, пасля паўтарэння паняццяў "гук", "літара", "галосныя і зычныя гукі", "цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя", "звонкія і глухія зычныя" настаўнік чытае верш з гульні "*Гусі-гусі*", а вучні на слых вызначаюць, які гук ў ёй ужываецца часцей, называюць яго – [г].

*- Гусі-гусі!*
*- Га-га-га!*
*- Есці хочаце?*
*- Ага!*
*- Дык ляціце…*
*- Го-го-го,*
*Воўк зубаты за гарой.*
*- Гусі-гусі!*
*- Гто-го-го…*
*- Вы не бойцеся яго!*

Фальклор каштоўны на любым з этапаў урока (тлумачэнне, паўтарэнне, кантроль). Вось як цікава можна падвесці вучняў да тэмы дыктоўкі, накіраваць іх увагу на тое, пра што яны будуць пісаць. Настаўніца гаворыць дзецям, што тэму дыктоўкі падкажа ім прыказка, якая запісана на плакаце ("Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка"). З прыказкі школьнікі здагадаюцца, што дыктоўка будзе пра той родны куточак, дзе яны нарадзіліся.

Настаўніца Жэмыслаўскай сярэдняй школы Іўеўскага раёна Станулевіч Н.В. лічыць ужыванне матэрыялаў народнай педагогікі неад'емнай часткай выхавання малодшых школьнікаў. Для дзяцей яна прапаноўвае разнастайныя народныя гульні, якія дапамагаюць выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, самабытнасць. Настаўніца на ўроках выкарыстоўвае гульні "*Лесавічок*". Умовы простыя: выбіраецца "лесавічок", астатнія дзеці пішуць на картках назвы раслін, якія растуць у лесе, сваё прозвішча і аддаюць карткі "лесавічку". Ён пачынае гульню: "Я быў у лесе, там растуць розныя расліны. Не было там толькі елкі". Той, хто запісаў на картца "елка", павінен сказаць: "Елка там ёсць, а вось ліпы няма". "Ліпа, у сваю чаргу, павінна сказаць: "Ліпа ў лесе ёсць, а вось…" Той, хто называе расліну, якая не расце ў лесе, або адкажа не ў свій час, плаціць "фант". Ён выкупляецца так: трэба расказаць пра тую расліну лесу, якую назаве "лесавічок". Гэтая і падобныя гульні спрыяюць пашырэнню ведаў дзяцей, развіваюць іх пазнавальную актыўнасць.

Вопыт паказвае, што задача педагогаў – актыўна ўкараняць у навучальна-выхаваўчы працэс усе сродкі народнай педагогікі, бо яны актыўна садзейнічаюць фарміраванню светапогляду, заснаванага на агульначалавечых каштоўнасцях, вызначаюць паводзіны ў паўсядзённым жыцці.

Рэпазіторый ГрГМУ

Спіс літаратуры

1. Краж, У.М., Трубчык, У.М. Беларускія народныя гульні: вучэбна – метадычны дапаможнік / У.М. Краж, У.М. Трубчык. – Мінск: Ванін. – 1997. – 111 с.
2. Лозка, А.Ю. Восеньскія святы: дапаможнік для настаўнікаў і выхаванцаў / А.Ю. Лозка. – Мінск: Беларусь. – 1995. – 110 с.
3. Шаляговіч, В.А. Запрашаем да народнай гульні / В.А. Шаляговіч // Пачатковая школа. – 1997. – 33 с.

## СЕКЦИЯ «КУЛЬТУРА»

## «КРЫЛАТЫЕ КОНИ» – ЖИВОЙ ОБРАЗЕЦ ЗЕМНОЙ КРАСОТЫ

*УО «Гродненский государственный медицинский университет»*
*Кафедра русского и белорусского языков*

*Авезметов Я., 2к., 2гр., ФИУ*

*Научный руководитель – старший преподаватель Барановская А.В.*

Средняя Азия – страна древних цивилизаций, могущественных соперников Эллады и Рима. Когда-то здесь поклонялись огню и приносили белых коней в жертву богу Солнца. Но легендарные цари и герои исчезли, грозные крепости и богатые города превратило в руины беспощадное время. Однако оно оказалось невластным над удивительным живым памятником славного прошлого – ахалтекинским скакуном. К седой древности Ниссы и Мерва, к "небесным" коням Ферганы восходит его родословная.

Имя ахалтекинской породе дали туркменское племя теке, которое искони разводило этих лошадей, и оазис Ахал, узкой полосой тянущийся у подножия хребта Копет-Даг от Бахардена до Артыка. Еще в начале века текинских лошадей из Ахала называли ахал-теке, а из оазиса Теджен – теджен-теке. Здесь, на краю Черных Песков, веками шлифовались качества этой уникальной породы, от отца к сыну передавались секреты ее разведения.

Туркменам нужен был друг, который мог бы выстоять в раскаленных песках, нести воина с оружием, тяжелой кошмой и запасами, преодолевая огромные расстояния изо дня в день. Само существование многих туркменских племен в значительной мере зависело от наличия у них превосходных коней. Особые условия пустыни диктовали и особое отношение к коню. Конь был лучшим другом туркмена, почти членом семьи. Такое отношение позволило осуществлять идеальную селекцию для постоянного совершенствования породы.

У туркмен есть пословица: "После того, как ты поприветствовал



Репозиторий ГрГМУ